«ВАЙНА — САМЫ СТРАШНЫ ГРЭХ...»

ЗВЯЗДА

8 мая 1998 г. пятніца, № 98 (23449)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● кошт 3000 рублёў

МІНУЛАЯ СЛАВА БЕЛАРУСКІХ ІЛЬНАВОДАЎ ПАВІННА БЫЦЬ АДРОДЖАНА

Усяго дзесятак гадоў таму на долю Беларусі прыпадала 12 працэнтаў сусветнай вытворчасці льновалакна. Лён быў візітнай карткай нашай краіны. Доўгі час ён займаў адно з вядучых месцаў у экспартнай прадукцыі рэспублікі. Для калгасаў і саўгасаў гэта была асноўная крыніца даходаў, якая абумоўлівала іх фінансавы дабрабыт. Аднак у апошняе дзесяцігоддзе пасяўныя плошчы пад гэтай культурай скараціліся ўдвая. У некаторых раёнах летась яна заняла менш як адзін працэнт ворнай зямлі. Ураджайнасць ільну склала ўсяго 3,6 працэнта з гектара пры біялагічных, гэта значыць магчымых, 10-ці цэнтнерах. У шэрагу раёнаў лён зусім загубілі.

Такая нярадасная карціна сённяшняга стану льнаводства ў рэспубліцы, аб чым з трывогай гаварыў прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў Оршы. Як паведамляла ўжо БЕЛТА, там 6 мая адбылася рэспубліканская нарада па льнаводству. На гэту сустрэчу членаў урада, прадстаўнікоў «вертыкалі» ўлады, вядучых спецыялістаў галіны льнаводы краіны ўскладалі вялікія надзеі, бо льнаводства мае патрэбу ў прыняцці кардынальных рашэнняў. І паводле ацэнкі, якую даў кіраўнік дзяржавы ў заключным выступленні перад прысутнымі на пленарным пасяджэнні ў канферэнц-зале Аршанскага льнокамбіната, размова атрымалася карыснай, канструктыўнай. Праўда, падкрэсліў ён, у выступленнях на нарадзе не адчувалася сапраўднай трывогі за сітуацыю, а яна — крызісная.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

ЦЭНЫ

ЖЫЦЦЁ Ў МІНСКУ ДАРАЖЭЙШАЕ

Апошнія даныя штотыднёвага адсочвання цэн на асноўныя прадукты харчавання ў абласных цэнтрах і сталіцы, што праводзіцца Камітэтам цэн Мінэканомікі, сведчаць аб тым, што ніякіх асаблівых узрушэнняў за апошні час тут не назіраецца. У большасці асобныя і (нешматлікія) змяненні кошту прадуктаў не перавышаюць двух працэнтаў. Праўда, гаворка ідзе толькі аб мінімальных узроўнях цэн на харчаванне, якія меліся на дзень рэгістрацыі ў магазінах рознічнага гандлю, што былі выбраны для назірання за цэнамі.

Так, самы танны хлеб масавых гатункаў прадаецца цяпер у Гомелі — на 6300 рублёў, самы дарагі — у Брэсце, Гродне і Мінску — па 6600 рублёў. Кошт батона вышэйшага гатунку (0,4 кг) вагаецца ад 6800 рублёў у Гродне і Мінску да 7500 рублёў у Брэсце, 7700 — у Гомелі і 8000 — у Магілёве. Кілаграм макаронных вырабаў найбольш дарагі ў сталіцы — 26.100 рублёў, самы танны ў Гомелі і Віцебску — адпаведна 23.700 і 23.800 рублёў. Цана мукі вышэйшага гатунку за кілаграм складае 16.800 у Віцебску, 17.200 — у Мінску і 17.500 — у Гродне. Ялавічыну на костцы выгадна набываць найперш у Віцебску — тут кілаграм каштуе 67.300 рублёў, у Брэсце яна ўжо «цягне» на 70.800, у Мінску — на 74.200, у Магілёве — ажно 82.600 рублёў. Вараная каўбаса (дзе яна ёсць у продажы) мае мінімальны кошт у Брэсце — 67.000 за кілаграм, максімальны ў Мінску — 71.200 рублёў. Паўлітра малака 2,5 працэнтнай тлустасці каштуе аднолькава 3400 рублёў у Брэсце, Віцебску, Гомелі і Гродне. Затое ў Магілёве і Мінску — адпаведна 3300 і 3600 рублёў. У Віцебску кілаграм масла прадаецца ў магазінах па 84.700, у Гродне — па 89.700, у Мінску — па 92.400 рублёў. Самы танны цвёрды сыр зноў жа ў Віцебску — 101.400 рублёў за кілаграм, самы дарагі — у Мінску, дзе яго кошт самы вялікі па краіне — роўна 113.000 рублёў. Цукар пяўсюдна каштуе амаль аднолькава — 24.200 — 24.400 рублёў за кілаграм. Дзесятак курыных яек (Д-1) абыходзіцца даражэй хатнім гаспадыням з Брэста — 26.600, на 200 рублёў менш плацяць за яго жанчыны ў Гродне і Мінску. Самы нізкі ўзровень цэн на гэты прадукт у Магілёве — 25.200 рублёў за дзесятак.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КАРТАК НА ПРАДУКТЫ НЕ БУДЗЕ?

Нягледзячы на ўсе афіцыйныя запэўніванні, народная пагалоска па-ранейшаму выдае інфармацыю аб нібыта плануемым увядзенні сістэмы размеркавання асноўных прадуктаў харчавання па картках. Відаць, старэйшаму пакаленню сённяшняя сітуацыя ў гандлі нагадвае нешта знаёмае, калі ў памяці ажывіліся «карцінкі» 1992—1994 гадоў...

«Ніякіх картак не плануецца. У міністэрстве нікому такія думкі не могуць прыйсці нават у галаву», — крыху раздражнёна адказаў на пытанне прэс-сакратар міністра гандлю Вячаслаў Лявонаў. — Гэта абсалютнае глупства. Я ведаю, чым выкліканы гэтыя размовы. Тым, што мясцовыя ўлады ўвялі больш жорсткія нормы водпуску прадуктаў». На думку работніка міністэрства, калі захоўваюцца такія нізкія цэны, гэта разбэшчвае людзей, маўляў, з'яўляецца жаданне набыць танней і прадаць даражэй. Як мы ўжо паведамлялі, рэалізацыя тых жа вараных каўбас сёлета павялічваецца як у параўнанні з цяперашнім планам, так і ў параўнанні з планам года мінулага. Але гэтыя лічбы сведчаць толькі аб рэалізацыі прадуктаў, а не аб іх спажыванні. На адной з прэс-канферэнцыі міністр гандлю прызнаў, што гэта менавіта так. Выходзіць, зноў чаўнакі? Але самі міністэрскія работнікі гавораць, што на многія прадукты харчавання існуюць даволі нязначныя тэрміны годнасці (асабліва актуальна гэта зараз), значыць, вывезці іх складана. У такім выпадку дзе ж прадукты, чаму ў магазінах чэргі? Замкнёнае кола.

У Магілёўскай вобласці спіс тавараў, на якія дзейнічаюць нормы водпуску, амаль не прымяняецца. Выключэнне складаюць толькі цукар, якога на рукі выдаюць не больш як па 2 кг, масла (300 г) і цвёрдыя сыры (300 г). Ёсць на Магілёўшчыне і каўбасы. Праўда, вараная каўбаса пад вечар у шэрагу магазінаў пачынае знікаць.

Ужо амаль месяц працягваецца цукровы ажыятаж на Гродзеншчыне. Людзі ўжо не вераць у заўтрашні «салодкі дзень» і закупляюць яго ў запас. Калі цукар «выкідваюць» у магазіны, яго тут жа скупляюць. Не ратуе цукар нават тая акалічнасць, што прадаюць яго тут толькі па кілаграму ў рукі.

Як нам паведамілі ў абласным упраўленні гандлю, у вобласць накіроўваецца 500 тон цукру з Магілёўскіх складоў дзяржрэзерву. Кіраўнікі абласнога ўпраўлення разлічваюць вырашыць праблему з цукрам на працягу тыдня. Зараз вядуцца перагаворы з адной польскай гандлёвай фірмай аб пастаўцы 2 тыс. тон цукру. Па словах суразмоўцы, калі будуць станоўча вырашаны пытанні па канвертацыі валюты, цукар у вобласці будзе каштаваць не болей як 24 тыс. рублёў за кілаграм. Паціху знікаюць з прылаўкаў магазінаў асобныя віды рыбы. Рыба да нас «прыплывае» з-за мяжы. За яе трэба плаціць валютай, а вось з канвертацыяй апошняй якраз і паўстаюць пытанні. Калі купляць долары па рыначнаму курсу, кошт рыбы ўзляціць угору, як птушка. Купляць жа валюту па афіцыйнаму курсу няма амаль ніякай магчымасці. Непрыкметна начынае знікаць з магазінаў алей. Які тавар стаіць чарговым у гэтым чорным спісе — невядома.

Сяргей РАСОЛЬКА, Сяргей КУРКАЧ.

ПА ТОЙ БОК ПРЫЛАЎКА

НАС РАТУЮЦЬ КУРЫНЫЯ КУМПЯЧКІ...

Дэфіцыт мяса птушкі цягнецца, напэўна, не нашмат меней, чым дэфіцыт свініны. У прыватнасці, толькі за I квартал года па краіне пры плане ў 10,5 тысячы тон фактычна было рэалізавана толькі 8 тысяч тон гэтай прадукцыі.

Адной з верагодных прычын такога становішча ў Міністэрстве гандлю па-ранейшаму называюць фірменны гандаль, маўляў, праз яго праходзіць прадукцыі больш, чым праз астатнія магазіны. Міністэрская статыстыка сведчыць, што за той жа I квартал, напрыклад, у Віцебскай вобласці праз фірменны гандаль было рэалізавана 340 тон мяса птушкі, хаця план быў толькі 188 тон, у Гомельскай — 850 тон пры плане ледзь не ўдвая меншым — 438 тон.

У гэтай сітуацыі сваёй несумненнай заслугай міністэрства лічыць заключэнне дагавораў на пастаўку імпартных курыных кумпячкоў. Сапраўды, яны ўжо з'явіліся ў продажы ў многіх магазінах. Праўда, і кошт іх унушальны — 112—115 тысяч рублёў за кілаграм (да таго моманту, як знікнуць у апошні раз іх максімальны кошт дасягаў 68 тысяч рублёў). У міністэрстве гэта тлумачаць проста: па-першае, курыныя кумпячкі не ўваходзяць у спіс прадуктаў харчавання, па якім адсочваюцца цэны, таму двухпрацэнтны ўзровень інфляцыі на іх не распаўсюджваецца; па-другое, яны набываюцца, зразумела за валюту, прычым апошняя бярэцца на міжбанкаўскай біржы недзе па 78 тысяч рублёў за кожны долар, бо, як вядома, дзяржава пад гэтыя патрэбы СКВ па афіцыйнаму курсу не выдзяляе. Урэшце мы і маем тую цану, якую маем.

Усяго за I квартал імпартных птушыных кумпячкоў завезлі звыш 1 тысячы тон, толькі на холадакамбінаты сталіцы іх за гэты час паступіла каля 300 тон. Закупляюцца яны па 94 тысячы рублёў за кілаграм і ідуць у продаж з мінімальнай аптовай (5 працэнтаў) і рознічнай (10 працэнтаў) гандлёвай надбаўкай. Зрэшты, як справядліва заўважылі ў Мінгандлі, «тавар павінен каштаваць столькі, колькі ён каштуе». Толькі да гэтых бы цэн яшчэ і адпаведную зарплату, бо адной наяўнасцю на паліцах харчавання чалавека не накорміш...

Сяргей РАСОЛЬКА.

ХОДЗЯЦЬ ЧУТКІ, ШТО...

...ЦУКРОВЫЯ ЗАПАСЫ ГАНДЛЮ ПАПАЎНЯЮЦЦА З ДЗЯРЖРЭЗЕРВУ

Чуткі аб маючым адбыцца папаўненні запасаў салодкай прадукцыі ў гандлі з дзяржрэзерву ў колькасці 50 тысяч тон у прэс-службе Міністэрства гандлю адразу катэгарычна абверглі.

«Я не ведаю, ці ёсць у дзяржрэзерве такая колькасць цукру. Гэтая інфармацыя цалкам не адпавядае рэчаіснасці. Што датычыць таго, ці бярэцца наогул тавар з дзяржрэзерву — так, бярэцца, гэта нармальная практыка. Ён бярэцца, а потым вяртаецца. Так было заўсёды і не толькі па цукру, бо існуюць пэўныя нормы па захоўванню — колькі тавар можа знаходзіцца ў дзяржрэзерве, потым яго трэба замяніць», — заявіў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Міністэрства гандлю Вячаслаў Лявонаў.

Ніхто не аспрэчвае таго, што павышаны попыт на цукар захоўваецца. «Хаця сітуацыя з кожным днём паляпшаецца, бо колькасць цукру, што паступае ў магазіны, пастаянна расце, прыходзяць новыя партыі», — паведаміў прэс-сакратар. Па звестках «Звязды», штодзённая рэалізацыя гэтай прадукцыі ў цэлым па краіне складае 400 тон. «Сапраўды, зараз на падыходзе чарговая партыя цукру ў колькасці 50 тысяч тон, але не з дзяржрэзерву, — зазначыў спадар Лявонаў. — Цукар трапляе да нас не з аднаго месца, асноўныя пастаўшчыкі — Украіна і Расія». Па словах прэс-сакратара, папярэднія партыі, у прыватнасці, 30 тысяч тон, што паступілі ў краіну з-за яе межаў, ужо з'елі. «Я адказна заяўляю, што цукар у продажы быў, ёсць і будзе. Не трэба ствараць паніку, што летам яго не будзе». На думку Вячаслава Лявонава, па цукру праблема сёння толькі адна — цэнавая. Работнікамі Міністэрства гандлю гэтая акалічнасць падкрэслівалася апошнім часам неаднаразова і на самых розных узроўнях. Зразумела, міністэрства самастойна цэны не вызначае, але яго пазіцыя адназначная: наш цукар самы танны, ён прадаецца ледзь не па аптовай закупачнай цане. Ці будзе даражэць гэтая прадукцыя? Відавочна, што салодкая «халява» (тым больш у такіх памерах, калі попыт не змяншаецца) доўга працягвацца не можа.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Гадзіннік адлічвай Перамогу...

— МАРЫЯ БАРЫСАЎНА, вы верыце ў лёс?

— Веру.

— А ў Бога?

— Ведаеце, на Бога я ніколі нічога не гаварыла дрэннага... У адным перакананая: ёсць нейкая сіла, якая валодае прыродай, адорвае чалавека рознымі пачуццямі. Сіла нейкая існуе. Хто гэта, што гэта?.. Богам назвалі — ну, хай будзе Бог.

— У моманты, калі было невыносна страшна, вы, можа, якую малітву ўспаміналі?

— Я вывучыла тры малітвы — «Ойча наш», «Верую» і «Троіцу». Але не для таго, каб маліцца. У мяне былі чорныя пышнаватыя валасы, здаралася, спынялі: «Юда?» Аднойчы нават прывялі да начальніка паліцыі. Каб даказаць, што не яўрэйка, пачала чытаць малітвы. Дзве прачытала, а канец «Троіцы» ад страху забыла. На шчасце, мяне перапынілі: «Хопіць!»

— У час вайны вы часта плакалі?

— Плакаць плакала — толькі калі побач нікога не было.

— Нават дачка не бачыла вашых слёз?

— Ніколі!

— Вы вельмі горды чалавек?

— Не таму што горды. Мае слёзы ўплываюць на іншага чалавека, разумееце? Я губляю веру ў сябе, калі пачынаю плакаць. Не хацела, не магла і не мела права паказваць камусьці сваю слабасць.

— Вам даводзілася мець кантакты з самымі рознымі людзьмі. У вас лёгкі характар?

— Не ведаю, лёгкі ці цяжкі... Усе нявесткі называюць мяне мамай.

— З нявесткамі ніколі не канфліктавалі?

— Божа збаў! Наадварот, калі нявестка бывае і віноватая, усё роўна на сына нападаю. Маці мая, бывала, гаварыла так: «Дачушка, помні, сына ты і яснеш па патыліцы, і праз гадзіну ён забудзецца. А ў нявесткі ўсё будзе паступова адкладвацца на сэрцы — і вырасце такая гара, што праз яе не пералезе ні яна, ні ты». Старыя людзі — разумныя. Мае бацькі былі непісьменныя, нават распісацца не ўмелі, але жылі мірна, ціха, спакойна, паважалі адно аднаго.

— У бацькоў вялікая сям'я была?

— Сямёра дзяцей — 5 сыноў і 2 дачкі. Усе дзеці хадзілі ў школу. Бацькі працавалі на шклозаводзе ў Серкавіцах Талачынскага раёна. Калі мне споўнілася 16, завод ліквідавалі. Старэйшы брат Алёша паехаў у Труды Полацкай округі, за ім паехала і я, уладкавалася на работу на шклозавод. Працавала і хадзіла ў вячэрнюю школу. Скончыла 9-годку з адзнакай.

— А раскажыце, калі ласка, пра сваё каханне. Было яно?

— Было. Чалавек ніколі не сыдзецца з тым, хто не падабаецца. Я працавала на заводзе, і маёй самасольскай нагрузкай было кіраўніцтва піянерскімі атрадамі. Працавала добра, мяне забралі ў райкам на піянерскую работу. Там і пазнаёмілася з Якавам Осіпавым, ён быў сакратаром райкама камсамола... Калі ў верасні 1932 года мужа перавялі ў Мінск, нарадзіўся сын Юра (дачцэ Томе было 5 гадоў), тады і вырашыла вучыцца. Якраз пры юрыдычным інстытуце ствараліся падрыхтоўчыя курсы. Вучылася добра, бо мне хацелася вучыцца. Дзяцей пакармлю, усё вымыю, прыбяру ў кватэры — і да 2-3 гадзін ночы сяджу, пакуль не выканаю ўсе заданні. Курсы скончыла з адзнакай, і мяне адразу залічылі студэнткай.

— Юрыдычны інстытут скончылі яшчэ да вайны?

— Так, я ўжо працавала членам Вярхоўнага суда.

(Заканчэнне на 2-й стар.)



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мужнасцю Марыі Осіпавай былі ўражаны нават ворагі...

З паведамлення асобай камісіі генеральнага камісарыята Беларусі па выніках расследавання забойства генеральнага камісара Беларусі В. Кубэ у ноч на 22 верасня 1943 г.

(29 верасня 1943 г.)

«У ноч на 22 верасня 1943 г. у 0.40 у спальным пакоі генеральнага камісара, гаўляйтэра Вільгельма Кубэ ўзарвалася міна... Яго труп у паўзгарэлым выглядзе быў выцягнуты выкліканай па трывозе камандай з палаючай спальні.

Пры аглядзе месца здарэння асобай камісіяй... былі знойдзены рэшткі ўзрывальніка магнітнай міны запаволенага дзеяння англійскай вытворчасці...

Паколькі жылы дом гаўляйтэра ўдзень і ўначы ахоўваўся асабістай аховай у 12 чал., то з самага пачатку паўстала пытанне аб прыслузе і асобах, якія мелі доступ у пакоі гаўляйтэра... Ужо раніцай 22 верасня 1943 г. было высветлена, што адзіная прыслуга, якая з-за няхваткі месца пражывала за межамі будынка, Алена Мазанік, не была знойдзена на сваёй кватэры. Яе сястра Валянціна Шчуцкая, якая пражывала разам з ёй, таксама не была знойдзена... Мазанік 21 верасня 1943 г., як звычайна, прыйшла на работу ў 7.00, скардзілася іншым служачым дома на моцны зубны боль і ў 10.30 пакінула дом.

...У час вобыску ў доме Мікалая Дразда... у хляве, у запалкавым карабку, былі знойдзены два ўзрывальнікі-запалы, якія, паводле даных Дразда, былі схаваныя там «Чорнай Марыяй», якая пазней была ўстаноўлена як Марыя Осіпава. Мікалай Дрозд, а таксама яго жонка Алена Дрозд і дачка Рэгіна Дрозд былі арыштаваны незадоўга да падрыхтаваных імі ўцёкаў...

У ходзе расследавання было таксама ўстаноўлена, што Осіпава з красавіка гэтага года жыла ў Дразда і ажыццяўляла так званыя «службовыя камандзіроўкі». Жывучы ў Дразда, яна ўзмоцнена займалася антынямецкай прапагандай і даволі паспяхова ўплывала на сваё акружэнне... Не падлягае сумненню, што Марыя Осіпава раніцай 21 верасня 1943 г. даставіла міны ў Мінск і там асабіста ці праз пасрэдніка перадала Мазанік... Вышук Мазанік і яе сваякоў, а таксама Марыі Осіпавай і Тоні наладжаны, але не абяцае поспеху, паколькі названыя вышэй асобы пасля замаху і выканання асобага задання, пры пасрэдніцтве Осіпавай, з бліжэйшага партызанскага аэрадрома будуць дастаўлены ў Маскву...

Расследуючы ўсе абставіны, высветлена, што верхаводам замаху з'яўляецца Марыя Осіпава. Непасрэднай выканаўцай, як ужо ўказвалася вышэй, з'яўляецца Алена Мазанік...

Кіраўнік асобай камісіі штурмбанфюрэр СС і крымінальны саветнік Бендорф».

УВАГА! На пытанні чытачоў «Звязды» 27 мая з 14 да 15 гадзін будзе адказваць генеральны дырэктар рэспубліканскага аб'яднання «Белпошта» Георгій ІГНАТОВІЧ

Дастаўка газет і паштовай карэспандэнцыі, грашовыя пераводы і пасылкі, аплата жыллёва-камунальных паслуг — спіс клопатаў, якія звязаны з дзейнасцю нашай пошты, здаецца бясконцым. Безумоўна, у нас як спажыўцоў айчынных паштовых паслуг часам узнікаць праблемы. Як вырашыць іх? Да каго звяртацца, калі раптам нешта здарылася?.. **27 мая з 14 да 15 гадзін вы, паважаныя чытачы, маеце унікальную магчымасць звярнуцца непасрэдна да генеральнага дырэктара «Белпошты» Георгія Яўгенавіча Ігнатовіча. Ён адкажа на вашы пытанні па тэлефонах: 232-38-21, 232-38-92.**

З пытаннямі, адрасаванымі кіраўніку «Белпошты», звяртайцеся і папярэдне. Мы чакаем вашых пісьмаў, шаноўныя чытачы.

УВАГА! ПРАМАЯ ЛІНІЯ

На вашы пытанні адкажа міністр сацыяльнай абароны Вольга Браніславаўна ДАРГЕЛЬ

Наўрад ці ёсць сэнс шмат гаварыць аб тым, што зараз даводзіцца цяжка амаль усім. Але чым у бліжэйшы час можа падтрымаць дзяржава пенсіянераў і інвалідаў, былых вайскоўцаў і сем'і, што выхоўваюць дзяцей — словам тых, хто ўжо ці яшчэ не ў стане забяспечыць сабе вартае жыццё ўласнымі сіламі? Пытанне, безумоўна, няпростае. Тым не менш, адказы трэба шукаць менавіта сёння, і рабіць гэта лепш разам. Таму 15 мая рэдакцыя «Звязды» мае намер запрасіць усіх чытачоў газеты да ўдзелу ў «прамой лініі» з міністрам сацыяльнай абароны Вольгай Браніславаўнай Даргель. У гэты дзень з 12 да 13 гадзін аб усім, што хвалюе, вы можаце пагутарыць з міністрам па тэлефонах: **(0-17) 232-38-21, 232-38-92.**

Папярэднія пытанні прымаюцца штодня па тэлефоне (017) 268-27-57.

ХАКЕЙ

Беларускія міністр, дэпутат і намеснік міністра «згулялі» за канадцаў

Колькі ваўка не кармі, а таго ўсё роўна ў лес цягне. Колькі балельшчыку не кажы, што выхад беларускай зборнай у чвэрцьфінальны раунд чэмпіянату свету па хакею, які праходзіць зараз у Швейцарыі, ужо поспех, — падавайце ім перамогі над шведамі, фінамі і іншымі канадцамі...

Так, зараз менавіта каманды Швецыі, Фінляндыі і Канады будуць сапернікамі беларусаў па групе (у другую групу трапілі расіяне, чэхі, славакі і швейцарцы), з якой у паўфіналы выйдуць толькі дзве мацнейшыя каманды. Ёсць сэнс і за прэстыж пазмагацца, і фінансавае становішча паправіць — напрыклад, толькі за выхад у паўфінал, каманды атрымаюць ад Міжнароднай федэрацыі хакея на 477 тысяч долараў. Дарэчы, калі працягваць ужо далей грашовую тэму, білеты на хакей абыходзяцца балельшчыкам па нашых мерках у добрую капейку: на матчы чвэрцьфінальнага раунда — ад 60 да 80 долараў, на паўфінальныя сустрэчы — ад 90 да 110 і на фіналы — ад 120 да 150 долараў ЗША.

Зрэшты, грошы грашыма, а хакей хакеем. І напярэдадні ўчарашняга матча беларусаў з канадцамі, мы, прытрымліваючыся старой добрай традыцыі, вырашылі пагуляць у гульню «Угадай лік матча Беларусь — Канада».

Мікалай АНАНЬЕЎ, міністр спорту і турызму Беларусі:

— 2:4 нашы прайграюць. На Алімпіядзе ў Японіі я бачыў гульню беларусаў з канадскімі «профі» і скажу, што згуляць горш на чэмпіянаце нашы хлопцы не павінны.

Анатоль СКОРБЕЖ, намеснік міністра прадпрымальніцтва і інвестыцый Беларусі:

— Як мне падаецца, канадцы выйграюць з лікам 4:2. Ну, а калі жаданні ды яшчэ супадуць з магчымасцямі, то чым чорт не жартуе...

Пётр ЖУШМА, дэпутат Нацыянальнага сходу Беларусі:

— Скажу так: веру ў лепшае, аднак прадбачу горшае — 5:2 на карысць канадцаў.

...Эх, будзе затым з каго спытаць!

Алесь СІВЫ.

ФУТБОЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА

Дэпутата Жушму пасялілі ў палаты Берыі

У Сочы днямі закончыўся традыцыйны міжнародны футбольны турнір на прызы «Комсомольской правды». З 16 каманд-удзельніц зборная беларускіх парламентарыяў заняла даволі ганаровае 5-е месца.

Трэба сказаць, што футбольная кампанія сабралася даволі прадстаўнічая: зборныя прафсаюзаў Расіі (за якую, дарэчы, гуляў былы маскоўскі спартакавец Юрый Гаўрылаў), расійскіх журналістаў, Дзярждумы, урада Расіі, Масквы, каманда парламентарыяў Арменіі, мэрыі Санкт-Пецярбурга, Наварасійска... Толькі апошнім, дарэчы, нашы і «дунулі» на сочынскім турніры, выйграўшы ўсе чатыры астатнія сустрэчы, але заняўшы толькі 5-е месца. Да слова, пераможца турніра (каманда «Газпром») атрымала ў якасці прыза 5 тысяч долараў ЗША, за 2-е месца (мэрыя Санкт-Пецярбурга) -- 3000 «зялёных» і за 3-е (мэрыя Наварасійска) -- 2 тысячы.

Беларускім парламентарыям грошай не далі за іх пяты радок, аднак уражанняў, напэўна, хапіла. Асабліва дэпутату Нацыянальнага сходу Пятру Жушме, якога пасялілі на сталінскай дачы ў 5-м нумары «Люкс», у якім у свой час спыняўся Лаўрэнцій Берыя. Кажуць, сапернікі абыходзілі на полі Пятра Яўгенавіча бокам...

Алесь СІВЫ.

КУРСЫ АБМЕНУ НАЯЎНЫХ ВАЛЮТ У КАМЕРЦЫЙНЫХ БАНКАХ І АФІЦЫЙНЫ КУРС, УСТАНОЎЛЕНЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ БАНКАМ НА 7 МАЯ 1998 г. (па стану на 15.00)

Назва банка	USD		DM		RUR		Тэлефон для даведак
	Купля	Продаж	Купля	Продаж	Купля	Продаж	
Мінск (0-17)							
Белпрамбудбанк	46000	47000	25500	26500	7300	7650	233-2110
Мінсккомплексбанк	46500	47000	26200	26500	7600	7650	228-2047
Пріорбанк	46500	47000	25900	26500	7500	7600	245-5721
Нацыянальны банк РБ (курс для безнаяўных разлікаў)	34970.00		19757.06		5710.00		Курс на 8.05.1998
Цэнтрабанк Расіі	6.1380		3.4764				

На працягу дня ўстаноўленыя курсы могуць мяняцца, курсы галаўнога ўпраўлення банка могуць неістотна адрознівацца ад курсаў, устаноўленых у абменных пунктах. Інфармацыя атрымана ад галаўных упраўленняў негандлёвых аперацый адпаведных банкаў.

Агенцтва ГРАЎЦОВА.

Рынкавы намінальны курс (міжбанкаўскі рынак)	65800	66800	37175	37750	10731	10895	
Рэальна абгрунтаваны курс (прыблізна)	54000	54500	32100	32500	12900	13300	

Наступны нумар «Звязды» выйдзе ў аўторак, 12 мая.

Вайскоўцы рыхтуюцца да Дня Перамогі

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе Міністэрства абароны, вайсковыя часці Узброеных Сіл Беларусі працягваюць падрыхтоўку да святкавання Дня Перамогі.

Напярэдадні 9 мая вайскоўцы прывядуць у парадак абеліскі, мемарыяльныя комплексы, брацкія магілы, замацаваныя за часцямі. У Дзень Перамогі на ўрачыстым пастраенні ва ўсіх воінскіх гарнізонах і часцях будзе аб'яўлены загад Міністэрства абароны, па вуліцах гарадоў краіны пройдуць ваенныя аркестры, будуць ускладзены кветкі да абеліскаў.

Згодна з загадам міністра абароны Рэспублікі Беларусь № 285, у азнаменаванне 53-гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў 9 мая 1998 года ў 22 гадзіны адбудзецца святочны салют у сталіцы краіны горадзе-герое Мінску і крэпасці-герое Брэсце.

Сяргей ПРОТАС.

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету 63850 (індэкс выдання)

ЗВЯЗДА

Колькасць камплектаў

на 1998 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды _____ (паштовы індэкс) _____ (адрас)

Каму _____ (прозвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА

ПВ | месца | літар

на газету 63850 (індэкс выдання)

ЗВЯЗДА

Кошт: падпіскі _____ руб.; пераадрасоўкі _____ руб.

Колькасць камплектаў

на 1998 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды _____ (паштовы індэкс) _____ (адрас)

Каму _____ (прозвішча, ініцыялы)

Гадзіннік адлічваў Перамогу...

РЭПАРТАЖ

«КАРМІЦЕЛІ»

Гэты першамайскі дзень, як і ва ўсіх вяскоўцаў, нічым не адрозніваўся ад будзённых для сям'і Ясінскіх з вёскі Кукляны. Першым у пачатку пятай гадзіны раніцы падняўся гаспадар, Іван Гіпольтавіч. Яго абавязак — накарміць кароў, коней. Хутка пасля бацькі выйшаў у дварышча і сын Пётр — паіць жывёлу. Ну а потым ужо зазвінелі даёнкамі жонка Алена Ермалаеўна і дачка Алёнка. Усе працуюць хутка, спорна, без лішніх размоў: гаспадарка вялікая, трэба ўправіцца хутка, бо, паснедаўшы, сын з бацькам каля сямі гадзін раніцы ўжо на калгасным мехдвары. Самы разгар сяўбы, Іван Гіпольтавіч адзін у гаспадарцы адказвае за сяўбу, вырошчванне буракоў, Пётр працуе на ворыве глебы. Ад сямі гадзін раніцы і да васьмі гадзін вечара яны на калгасным полі і ў гэты святочны дзень. Абед прывозіла калгасная «лятучка», ну а падвячорак бралі з сабою. Пакуль вярнуліся дадому — ужо пачало шарэць. Зноў трэба рупіцца, каб да цямна ўправіцца па гаспадарцы. Абрабляць сваю зямлю механізатары яшчэ і не браліся — найперш калектыўнае. Ну а ўжо потым, калі стане крыху вальней, дойдуць рукі і да свайго надзелу.

Гаспадарка ў Ясінскіх вялікая. Жывуць яны амаль што на хутары, ды і ў вёсцы жыхароў, параўноўваючы з ранейшым, засталося толькі трэць. Так што зямлі, сенакосаў хапае, толькі не лянуйся, працуй. Трымаюць сям'ёй трох кароў, свіней, авечак, курэй, ёсць 12 калодаў пчол, у спецыяльна выкапанай сажалцы — карасі. Асаблівая гордасць гаспадара — конь і кабылы. Вельмі любіць ён коней, бацька ўвесь час працаваў конюхам, ды і з маленства, з часоў аднаасобных гаспадарак, прыкіпела ў Івана Гіпольтавіча душа да гэтай жывёлы, надзейных памочнікаў хлебароба і ў нашы часы. На пачатку перабудовы пісаў даліст у Маскву, Гарбачову, менавіта з просьбай дазволіць трымаць у асабістай гаспадарцы коней.

Цяпер усё дазволена, калі ёсць сілы — можна жыць на вёсцы. У сям'і Ясінскіх, напрыклад, купляюць толькі чорны хлеб, белы гаспадыня пячэ сама — і смачней, і танней атрымліваецца. Яна працуе лесніком у калгасным лесе. Хата Ясінскіх — за нейкія сто метраў ад стараверскай царквы, знешне нічым не адрозніваецца ад іншых вясковых хат. Але тое, што тут жывуць працавітыя людзі, што пануе ў хаце дабрабыт, — бачна адразу. Ды затое ж ад першых веснавых дзён і аж да першага снегу не ведаюць механізатары, што такое выхадны. Абодва мужчыны заядлыя паляўнічыя, ды ўлетку пра стрэльбу і думаць няма калі. Любая вольная ад работы ў калгасе часіна — альбо з касою ў руках, альбо з акучнікам, альбо з іншай сельскагаспадарчай прыладай. 6 тон малака ў сярэднім здае штогод у калгас сям'я, як мінімум адно цяля, ды і мёд, мяса, смятана, воўна таксама ідуць людзям. Найбольш падыходзіць да кожнага члена гэтай дружнай сям'і вызначэнне «карміцелі». Так, сапраўдныя карміцелі жывуць у Куклянах.

У той дзень, вандруючы па калгасных палях, сустракаючыся і гутарачы з механізатарамі, я бачыў вельмі многіх людзей, падобных да Ясінскіх, негаваркіх, ужо прапаленых сонцам, спакойна прымаючых свой нялёгкі хлебаробскі лёс.

Вось Валерый Браніслававіч Ворса, у свой час давялося яму пакаштаваць сталічнага жыцця. Працаваў у Мінску ў другім аўтобусным парку, жонка — на камвольным камбінаце. Але потым пацягнулі родныя мясціны.

Сёння ў Валерыя Браніслававіча ўжо тры дачкі, двое ўнукаў, сталых гадоў чалавек. А працуе на гусенічным трактары «ДТ-75». Толькі самі механізатары да канца ведаюць, якая цяжкая, а часам і шкодная для здароўя гэта праца — пыл, вібрацыя. У такіх сярэдніх па эканамічнаму становішчу гаспадарках, як калгас імя Кірава, пра новую, тым больш замежную, тэхніку, дзе прадугледжана і ахова працы механізатара, пакуль што даводзіцца толькі марыць.

На сяўбе збожжавых у той дзень працавалі чатыры адносна маладыя механізатары — Юрый Пяткевіч, Яўген Якян, Аляўцін Бучэль, Іосіф Дуброўскі. Людзей у гаспадарцы не хапае, таму хлопцы абыходзяцца без сеяльшчыкаў, выконваюць іх работу, кантралюючы якасць сяўбы. За гэта — 30 працэнтаў даплаты. Увогуле, у гаспадарцы пастараліся выкарыстаць усе магчымасці, каб нялёгкая работа механізатараў на сяўбе аплачвалася дастойна. Расцэнкі старыя, даўно не адпавядаюць існуючай сітуацыі, таму на перыяд масавай сяўбы прадугледжаны надбаўкі для тых, хто працуе на гусенічных трактарах — 100 працэнтаў, а хто на коловых — 75. Увогуле ж зарплата, хоць і не такая высокая, як бы хацелася, выплачваецца ў калгасе рэгулярна.

Не хацелася б, каб у чытача склалася ўражанне, што знайшоў я ідылічны куточак, дзе вяскоўцам жывецца — не тужыцца. Гэта далёка не так. Ёсць у вёсках калгаса тыя, хто абмяжоўваецца бульбачкай ды хлебам. Нядаўна перабраўся ў калгас Анатоль Бадун. У яго трое дзяцей — ну, а дабра, так атрымалася, яшчэ не нажыта зусім. У калгасе прынялі сям'ю з разуменнем, выдзелілі хату для жылля. Анатолю далі трактар «К-700», ён у той майскі дзень працаваў на ворыве. Жонку ўладкавалі даяркай, старэйшы сын пайшоў на лета працаваць пастухом. Ды і мясам, іншымі прадуктамі новай у гаспадарцы сям'і дапамагаюць. Калі будуць людзі працаваць так, як узяліся адразу, калі завядуць сваю гаспадарку — падымецца сям'я.

...Калгасны аўтобус прывёз з Пастаў групу жанчын. Усе яны працуюць у гаспадарцы па накіраванню цэнтра занятасці насельніцтва.

Палічылі, што і 1 мая можна правесці ў полі. Займаюцца жанчыны падборам з палёў камення, яго таксама вельмі шмат на землях калгаса. Працуюць з васьмі раніцы да трох дня без перапынку. Па дамоўленасці з праўленнем атрымліваюць у дзень 100 тысяч рублёў кожная. Задаволены жанчыны, якія не могуць знайсці пастаяннае месца працы, задаволены і ў калгасе: у час уборкі ўраджаю менш будзе паломак на камбайнах.

Калгас імя Кірава знаходзіцца зусім недалёка ад мяжы з Літвою. Састаў насельніцтва тут вельмі цікавы. Ёсць беларусы як каталіцкага, так і праваслаўнага веравызнання, шмат стараверaў, што перасяліліся ў гэты куток Беларусі стагоддзі назад, ёсць татары. Але рознацы, нейкага процістаўлення адзін аднаму я не ўбачыў нават нацыянальныя прыметы ў рысах твару цяжка было заўважыць. І не толькі таму, што твары механізатараў густа пакрытыя веснавым пылам. Вельмі частыя змешаныя шлюбы, і хоць менее людзей у вёсках, жывуць яны, як мне здаецца, дружней.

Алесь КАСЦЕНЬ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Жанчыны ў час вайны праяўлялі такую самаахвярную любоў да Радзімы і такую мужнасць, што фашысты, не разумеючы гэтага, усё спісвалі на фанатызм. Ды і зараз у маладзёжным асяроддзі не-не ды і пачуеш: не трэба было жанчыне браць у рукі зброю...

— Калі на тваіх вачах забіваюць дзіця, жанчыну ці расстрэльваюць знясіленых ваеннапалонных... Ніводнае сэрца не вытрымае. Усе стараліся, як маглі, нашкодзіць ворагу: жанчыны, дзеці. Куды я сама не магла пайсці, хаціла мая дачка Тома. Калі пачалася вайна, ёй споўнілася 12 гадоў. Тома і пісталеты насіла, і лістоўкі распаўсюджвала... Калі фашысты пачалі знішчаць яўрэяў, я забірала да сябе на кватэру і дарослых, і дзяцей. Карміць няма чым — Тома хадзіла «по миру» збірала ежу. Жабравала — а што было рабіць?..

...Я чытаю пісьмы — пісьмы ад яўрэяў, якія засталіся жывымі дзякуючы Осіпавай. Яна выратавала не адзін дзесятак яўрэяў. Яе кватэра была перасылачным пунктам, дзе ўцекачы ад смерці атрымлівалі аўсвайсы. Дачка Тамара суправаджала яўрэяў у партызанскую зону... Не выпадкова Осіпавай было прысвоена ганаровае званне Ізраіля «Праведнік міру».

— Першыя дні вайны — якія яны былі для вас?

— Я нічога не ведала пра сваіх дзяцей. Дачка адпачывала ў маёй сястры каля Асіповіч, сын — у дзіцячым садку за горадам (з Юрам мы сустрэліся толькі ў канцы 43-га, яго адшукалі, калі я ўжо была ў Маскве, — садок паспелі эвакуіраваць у Свярдлоўскую вобласць). Як толькі акупіравалі Мінск, да мяне прыйшла Тоня Сакалова, работнік юрыдычнага інстытута. Пытае: «Што будзем рабіць?» Нават не ведаю, — кажу, — як зарыентавацца. Разам пайшлі на Заслаўскую вуліцу, у інстытуцкі інтэрнат. Вакол нас сабраліся студэнты, усе ў адзін голас: «Як добра, што вы прыйшлі, Марыя Барысаўна, станеце нашым кіраўніком». Калі вучылася, была сакратаром партарганізацыі інстытута, мяне добра ведалі. Гавару: «Я арыентуюся ў абстаноўцы гэтак жа, як і вы, прыйшла проста параўнацца». — «Мы будзем рабіць усё, што скажаце». Калі так — добра, буду камандаваць вамі. Яны і прыдумалі мне падпольную мянушку — Чорная.

— У вас, напэўна, доўгія валасы былі?

— Доўгія густыя валасы, тугая каса ніжэй пояса... Касу абрэзала 35 гадоў таму: цяжка расчэсваць валасы, рукі дрэнна пачалі слухацца. Зараз ужо і ногі не хочуць хадзіць, заленаваліся ад спакойнага жыцця... А раней так хутка хадзіла — і на самалёце не дагоніш!.. У час той першай сустрэчы ля інстытуцкага інтэрната спытала ў хлопцаў, хто ўмее маляваць. Падахвоціўся Рафа Бромберг. Папрасіла яго намаляваць вялікую фігу не менш чым на дзесяці аркушах, падпісаць: «Вось вам, фашысты, Масква!» і расклеіць па гораду. Ужо ў той час, у канцы ліпеня 41-га, немцы крычалі, што Маскву амаль акупіравалі...

Я жыла ў Кузнецкім завулку, што па Койданаўскаму тракту (зараз там пабудавалі свой Палац чыгуначнікі). Суседкай па кватэры была Ліда Дзяменцьева, мы жылі ў асобных пакоях, а куханька была агульная... Дык вось, праз пару дзён Ліда расказвае: бачыла лістоўку з фігай, як людзі радаваліся!..

❑

— Марыя Барысаўна, пасля вайны пісалі пра тое, што былі прызначаны канкрэтныя людзі для арганізацыі камуністычнага падполля...

— Нічога не было! Самі шукалі адзін аднаго, аб'ядноўваліся... Кіраўнікі на машынах барахло вывозілі і з'язджалі. А мы засталіся кінутыя.

— Падпольныя групы арганізоўваліся самастойна, стыхійна?

— Так. Ужо пазней, к канцу 41-га, быў створаны гаркам партыі. Праз нейкі час пачаліся правалы. Адзін аказаўся сволаччу, правакатар трапіў у гаркам... Таму ў сваёй групе старалася захоўваць строгую канспірацыю. Ніколі не збіраліся групамі. У мяне толькі дваіх арыштавалі.

— У вас вялікая група была?

— 50 чалавек. Пасля вайны, здаралася, у мяне сустракаліся знаёмыя — адзін у аднаго са здзіўленнем пытаюцца: «А ты чаго тут?» — «Я з Марусяй у вайну працаваў». Толькі пасля Перамогі даведваліся, што былі ў адной падпольнай групе.

— Вы падтрымліваеце сувязь са сваімі ваеннымі сябрамі?

— Так, хаця многія партызаны і падпольшчыкі, на жаль, ужо пайшлі з жыцця: час няўмольны... Толькі што званіла з Германіі Алена Давыдаўна, яна яўрэйка, а яе муж Мікалай Мікалаевіч Крачатовіч — рускі, па майму заданню працаваў манцёрам у гарадской управе. У яго залатыя рукі: умеў падрабляць ключы да сейфаў, дзе захоўваліся дакументы, і выкрадаў патроху: сёння — з аднаго сейфа, заўтра — з другога. Калі мы арганізоўвалі ўцёкі ваеннапалонных з лагераў смерці, трэба было паклапаціцца і пра дакументы для іх, інакш па гораду не прайсці. Прычым паліцаі чапляліся горш за немцаў.

— Чым гэта можна растлумачыць?

— Дык у паліцыю ішлі толькі па добрай волі, не мабілізоўвалі ў паліцыю. У паліцыю ішлі здраднікі. А сумленныя людзі ішлі ў лес, у партызаны, або ў падполле — змагаліся з ворагам... І як такое можна ўявіць: зараз паліцаі ставяць пытанне, каб іх прызналі ўдзельнікамі вайны! Упэўнена: у нас людзі больш справядлівыя, чым у Прыбалтыцы, не дапусцяць глумлення над памяццю.

Наогул, у кожнага народа ёсць і добрыя людзі, і дрэнныя. Са мной супрацоўнічалі два немцы, якія служылі ў лагерах смерці ў Масюкоўшчыне, — Эміль Шульц і Генрых Трыпель. Яны дапамагалі нам выкрадаць ваеннапалонных. А колькі такіх выпадкаў было: гоняць калону ваеннапалонных, людзі выбягаюць на дарогу — у каго бульбіну, у каго бурачок, лустачка хлеба: стараюцца аддаць нашым. Некаторыя немцы-ахоўнікі рабілі выгляд, што не заўважаюць. А былі і такія: як убачаць, што бягуць да калоны дзеці і жанчыны, дык наводзяць вінтоўку і страляюць.

— Суседзі падазравалі, чым вы займаецеся?

— Так, але калі б вы ведалі, якія гэта былі цудоўныя людзі, каб не яны — мы б век не перамаглі такога моцнага ворага, як нямецкі фашызм... Ды ў нас у кватэры ўвесь час тоўпіліся яўрэі, прыходзілі сувязныя з партызанскага атрада — не ведаць гэтага было немагчыма. Але ніхто не выдаў. Наадварот, стараліся дапамагчы мне, выратаваць. Аднойчы папярэдзілі, каб мы з дачкой тэрмінова ўцякалі. Дачку адправіла з сувязной Галяй Фінскай, а сама раніцай выбіралася агародамі. Мяне ўбачыла жанчына з суседняга дома: «Куды вы ідзяце?» — «Сама не ведаю...» — «Што, ужо данёс нехта?..»

А як рызыкавала мая суседка Ліда! У нас часта начавалі людзі, калі няма дзе пакласці — ідзём у суседні пакой да Ліды. Для «прыкрыцця», каб лягчэй было праходзіць паліцэйскія пасты, Ліда выпраўляла са мной свайго маленькага сына Генадзя, гады тры яму было. Адзін раз я паклала міну ў штонікі хлопчыка, яны ўнізе зашпільваліся на гузікі. Цудам засталіся жывымі — немец прапусціў, не стаў абшукваць малога. Потым сказала Лідзе: «Ніколі больш не вазьму Генадзя, так спужалася за яго жыццё... Мяне забіюць — няхай сабе, але ж ты магла застацца без сына».

— Далёка ад Мінска знаходзіўся штаб атрада?

— 55 кіламетраў. Выходзіла з горада звычайна гадзін у 10 раніцы, у тры—чатыры дня — на месцы. Пераночую, а раніцай назад.

— А які абутак у вас быў?

— Босая хадзіла. Знаёмыя дапамагалі як маглі, рабілі тапачкі з вяровак, але ў асноўным хадзіла басанож.

«Вайна — самы страшны грэх...»

— Колькі мін вы прынеслі ў акупіраваны Мінск?

— Пяць. У верасні 43-га несла міны для Кубэ.

— Зараз некаторыя гісторыкі і журналісты спрабуюць абяліць, «перапісаць» вобраз гаўляйтэра: маўляў, таленавіты паэт Вільгельм фон Кубэ не мог быць катам беларускага народа, а пасля ўдалай акцыі падпольшчыкаў фашысты зусім азвярэлі — яшчэ больш забівалі, палілі, катавалі...

— Няпраўда!!! І да гэтага палілі, забівалі людзей сотнямі тысяч. Адзінае, што пасля 21 верасня 43-га ў турме расстрэльвалі людзей не толькі ўначы, але і сярод белага дня.

— Сапраўды, Хатынь і многія дзесяткі беларускіх вёсак былі спалены фашыстамі з ведама Кубэ, і Трасцянец, і механізмы знішчэння насельніцтва ў многіх іншых пунктах працавалі бесперабойна...

— А скажыце мне, калі ласка, чаму зараз так рэдка ўспамінаюць: фашысты планавалі знішчыць 75 працэнтаў насельніцтва Беларусі, а астатнія жыхароў ператварыць у рабоў, у рабочую сілу. Вось як стаяла пытанне... Усё гэта занатавана ў нямецкіх дакументах, загадах: ажыццяўлялася нацысцкая тэорыя «прасторы без народа». Вільгельм фон Кубэ спраўна выконваў сваю місію, і дзякуючы яму фашысцкая машына смерці дзейнічала бязлітасна.

— Марыя Барысаўна, як вам удалося пранесці міны ў акупіраваны Мінск?

— У атрадзе папрасіла дзве англійскія міны (англічане дапамагалі нам зброяй, дай Бог ім здароўя!) з 24-гадзінным заводам: мы павінны былі загадзя зарадзіць міну, пакласці і пайсці з горада — каб міна спрацавала, калі нас ужо не будзе ў Мінску... У той раз са мной хадзіла ў лес Марыя Рыгораўна Грыбоўская, маці чатырох маленькіх дзяцей: напярэдадні я прастудзілася, усю ноч трызніла, і калі раніцай устала, каб ісці ў атрад, мяне не адпусцілі адну Мікалай і Алена Дрозд, у якіх я жыла... Міны несла ў кошыку з брусніцамі. Зверху паклала яшчэ тры дзесяткі яек. Па форме міны былі паўкруглыя (як разрэзаная ўпоперак шклянка).

Заўсёды, калі адыходзіла з партызанскай зямлі, перш чым пераступіць маленькую рачулку Вяча, станавілася на калені і цалавала зямлю: невядома, ці буду яшчэ тут стаяць... З Марыяй Рыгораўнай дамовіліся, што пойдзем паасобку. Яна таксама пацалавала апошні кавалачак партызанскай зямлі і пайшла па полі. Калі яе ўжо амаль не было відаць, пераступіла рачулку і я... Падыходзячы да саўгаса «Вішнёўка», дзе быў буйны фашысцкі гарнізон, убачыла, як абшукваюць Марыю Рыгораўну. Што рабіць: павярну назад — поле адкрытае, паліцаі кінуцца за мной. Думаю, што будзе — тое будзе, пайду... Паліцаі загадалі высыпаць з кошыка ягады — адмовілася: «Яны ж будуць у пяску, хто іх у мяне купіць?» Прыгразілі, што адвядуць да начальніка — я зрабіла выгляд, што ўзрадавалася: «Вось добра, я ведаю начальніка і раскажу яму, як вы разлуяце народ супраць нямецкай улады!» Пашапталіся паліцаі, узялі ў мяне грошы на гарэлку ды яйкі на закуску. На развітанне я атрымала такую аплявуху — некалькі дзён у галаве гуло... А потым з мяне ручаямі ліў халодны пот — быццам хто ўзяў кубак вады і паліваў: адчувала, з якога пекла выскачыла... Пры ўваходзе ў Мінск зноў удалося адгаварыцца.

Праз тры дні я прыйшла да Алены пад выглядам куплі туфляў. Пакуль мы «таргаваліся», я растлумачыла Алене, як зарадзіць міну і як падкласці. Правялі эксперымент на Аленіным ложку, паклалі міну на другі рад спружын. Яна села на ложак, пакачалася — міна трымаецца добра. Алена сцвярджала, што яе не правяраюць, але на ўсякі выпадак вырашылі, што панясе міну не ў сумачцы, а каля грудзей. Параіла, каб яна на ўсякі выпадак сімулявала зубны боль. Назаўтра ў 10 гадзін раніцы я чакала яе ў сквэрыку ля драмтэатра: «Палажылі? — «Так, усё ў парадку...»

❑

Залатая Зорка Героя Савецкага Саюза была ўручана Марыі Осіпавай у 1943 годзе.

А праз паўстагоддзя, у 93-м, у Гераіні ўкралі усе ўзнагароды — і Зорку, і ордэны, і медалі.

Цяжка зразумець, асэнсаваць рэаліі сучаснасці. Горка ўсведамляць, што дзесьці побач жывуць людзі, для якіх не існуе нічога святога...

— Як гэта здарылася, Марыя Барысаўна?

— Пазванілі ў дзверы. Спыталася, хто? «Мы з Савета ветэранаў, збіраем матэрыял для кнігі». Назвалі прозвішчы... Вы б адчынілі дзверы?

— Так...

— І я адчыніла. Двое маладых здаровых мужчын... Паглядзелі ўзнагароды, дакументы. Папрасілі вады папіць — пакуль хадзіла на кухню, яны ўсё забралі і збеглі, іх чакала машына... Зладзеяў не знайшлі. Зрабілі дублікат Залатой Зоркі.

— Зорка Героя Савецкага Саюза — сапраўды залатая. Колькі грамаў золата ўтрымлівалася?..

— Не ведаю, для мяне не гэта важна было...

Зладзеяў не знайшлі...

Але ёсць і Вышэйшы суд. Хай ён вынесе нягоднікам свой жорсткі прысуд — гэта будзе справядліва.

❑

Марыя Осіпава, жанчына-легенда... Сёння ёй 89 гадоў. І яна жыве па-ранейшаму з цікавасцю. Штодня глядзіць па тэлевізары навіны, чытае газеты(альбо, калі дробна надрукавана, просіць пачытаць сына, унучку, суседку).

— Марыя Барысаўна, які грэх нельга дараваць чалавеку?

— Вайна — самы страшны грэх. Гібель людзей, ні ў чым не вінаватых людзей...

— У імя чаго варта жыць?

— Чалавек жыве, каб жыць, — дзеля любові і дзеля працы. Хачу, каб і праўнукі (я багатая: дзве праўнучкі і два праўнукі!) былі такія ж, як і мае дзеці, — сумленныя, працавітыя, добрыя. Каб былі шчаслівыя... Шчасце — гэтае слова ўбірае ўсё жыццё.

Таццяна ПАДАЛЯК.

Раман КАРСЕКА:

«НЕЛЬГА ДАПУСЦІЦЬ, КАБ «ДЗІКІ» РЫНАК УВАРВАЎСЯ Ў АДУКАЦЫЮ»

Карэспандэнт «Звязды» гутарыць з рэктарам Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта Раманам КАРСЕКАМ.

— За 65 гадоў свайго існавання Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт падрыхтаваў больш за 60 тысяч спецыялістаў — цэлы горад раённага маштабу. Сёння сацыяльны заказ змяніўся. Якім чынам удалося адрэагаваць на гэта вашым выкладчыкам?

— Наша ВНУ стваралася для канкрэтных патрэб — падрыхтоўка спецыялістаў для сацыялістычнага тыпу эканомікі. Ва ўмовах рэфарміравання нам прыйшлося цяжка, бо выпускнікі павінны працаваць не толькі сёння, але і вырашаць адпаведныя задачы ў перспектыве. Неабходна было сур'ёзна задумацца і над канцэпцыяй адукацыі. Разуменне гэтых задач прыйшло да выкладчыкаў ужо напрыканцы 80-х гадоў — навукоўцы заўсёды ідуць наперадзе практыкі. Мы добра разумелі, што з развіццём міжнароднага супрацоўніцтва паступова будуць укараняцца новыя напрамкі эканомікі.

Напэўна, самае важнае, не ва ўсіх выкладчыкаў пакуль адбылася перабудова разумення — гэта доўгі шлях. Ды і нашым выпускнікам прыйдзецца яшчэ гадоў дваццаць працаваць ва ўмовах пераходнага перыяду, калі будуць дзейнічаць паўныя рычагі адміністратыўнай сістэмы і ў той жа час значная частка прадпрыемстваў пачне актыўны пераход да рынкавых адносінаў.

Мы будзем будаваць сваю эканоміку. Усе замежныя краіны маюць свой спецыфічны шлях развіцця, хоць у кожнай з іх дастаткова стабільны капіталізм (тып эканомікі, які ўстаяўся). Мы ж пакуль толькі фарміруем, шукаем ласную мадэль развіцця з улікам нашых умоў, менталітэту і г. д. Капіраваць нельга, так проста нічога не атрымаецца.

— Але ж пэўныя рысы нашага тыпу эканомікі ўжо сёння можна ўбачыць?

— Асноўны напрамак зразумелы — сацыяльна арыентаваная рынкавая эканоміка. Аднак сказаць лягчэй — неабходна пабудаваць. Галоўнае, як я лічу, неабходна вырашыць кардынальнае пытанне: наблізіць чалавека да ўласнасці. Гэта самы магутны стымул, які здольны актывізаваць працэс рэфарміравання.

— Ці не атрымаецца так, што ва ўмовах сацыяльна арыентаванай, аднак усё ж рыначнай эканомікі неабходна будзе звярнуцца да адміністратыўных мераў уздзеяння на вытворцу? Тут няма супярэчнасці?

— Адміністратыўныя меры таксама неабходныя, без іх не абысціся. Нават у апошніх аглядах Сусветнага банка шмат матэрыялаў было прысвечана ўзмацненню дзяржаўнага рэгулявання эканомікі. Іншая справа, што будзе вырашаць дзяржава, а што вытворца, які павінны быць максімальна зацікаўлены ў выніках сваёй працы. Гэта самае складанае пытанне. Да таго ж у эканоміцы існуюць свае аб'ектыўныя законы, якія неабходна ўлічваць. Самы ж галоўны фактар — час, нельга абагнаць падзеі, неабходна сфарміраваць псіхалогію людзей. Можна хоць сёння абвясціць: раздаём зямлю калгаснікам. Аднак хто яе будзе браць? Да гэтага неабходна быць псіхалагічна падрыхтаваным.

— Такім чынам, мы ў эканамічных пытаннях яшчэ доўга будзем адставаць ад развітых замежных краін?

— Мы з імі знаходзімся ў розных сітуацыях, нам неабходна прайсці ў сваім эканамічным развіцці адпаведныя этапы, неабходны пэўны час. Патрэбна настойліва працаваць, шукаць рацыянальныя і эфектыўныя шляхі развіцця. Мы гэта разумеем і такім чынам тлумачым сітуацыю студэнтам.

— Якога спецыяліста вы рыхтуеце?

— Нам неабходна было прынцыпова гэта вызначыць, таму што за мяжой у апошнія гады была такая тэндэнцыя: рыхтаваць спецыяліста-прагматыка, які б дасканала ведаў вызначаны напрамак дзейнасці. Такі падыход някепскі для інжынера, аднак яго нельга выкарыстаць для галіны эканомікі і кіравання — тут усё даволі дынамічна, адбываецца рух, скачкі, шмат праблем, якія адразу ж неабходна аналізаваць і вырашаць. Вывучыўшы замежны вопыт, мы прыйшлі да высновы, што неабходна перш за ўсё фундаментальная падрыхтоўка: даць студэнтам разуменне асноўных катэгорый, крытэрыяў любых сістэм. Наша задача — сфарміраваць навуковае мысленне, разуменне працэсаў. Другая прыступка — агульнагуманітарная падрыхтоўка, таксама вельмі неабходная частка адукацыі. Я ўвесь час кажу студэнтам: «Асноўная навука для эканаміста — філасофія». І гэта сапраўды так, бо без яе засваення не можа быць адукаванага спецыяліста.

Трэці цыкл — агульнанавуковыя дысцыпліны, своеасаблівы «інструмент», які спатрэбіцца нашаму выпускніку ў яго далейшай дзейнасці. Тут наша асаблівая ўвага — вывучэнню матэматычных дысцыплін, камп'ютэрных тэхналогій і замежных моў (дарэчы, уступны экзамен па гэтаму прадмету здаюць усе абітурыенты). Ну і апошняя частка — прафесійная падрыхтоўка.

— Ці існуюць праблемы працаўладкавання выпускнікоў?

— Асаблівых праблем тут няма. Нашы студэнты ўладкоўваюцца ўжо падчас вучэбнай практыкі, да таго ж мы не пашыраем колькасць абітурыентаў дзённай формы навучання, лічым, што неабходна рыхтаваць спецыялістаў сапраўды высокага класа, якія б маглі і выкладаць. Адкрываюцца эканамічныя спецыяльнасці і ў іншых ВНУ, а дзе ім кадры ўзяць?

— Так, сёння з'яўляецца шмат недзяржаўных, камерцыйных ВНУ, у якіх, як вы адзначылі, не заўсёды ёсць кваліфікаваныя выкладчыкі. Усё гэта ўплывае на якасць адукацыі, ці не так?

— Тое, што галіна развіваецца — гэта добра, але якасць можа не заўсёды адпавядаць, такое здараецца. Неабходна прымаць сур'ёзныя меры, нельга дапусціць, каб «дзікі» рынак уварваўся ў адукацыю. Гэта проста небяспечна. Я за развіццё адукацыі, але неабходна, каб яна была якаснай.

— Ці не з'яўляецца менавіта моднасць прафесіі пабуджальным матывам для паступлення ва універсітэт?

— Не думаю, моладзь арыентуецца ў жыцці вельмі хутка і добра разумее, якія дзе існуюць патрабаванні. У нас не такі ўжо вялікі конкурс, але ва універсітэт ідуць паступаць вельмі падрыхтаваныя абітурыенты — у сярэднім кожны год па аднаму медалісту на месца. Прыходзяць з разуменнем, што гэта ім неабходна, таму і не расчароўваюцца.

— Якія асаблівасці сёлетняй прыёмнай кампаніі?

— На некаторыя спецыяльнасці будуць асобныя конкурсы для вясковай і гарадской моладзі.

— Такіх студэнтаў у далейшым неабходна будзе «падцягваць»?

— Канешне. Але мне асабіста вельмі не падабаецца сама сістэма ўступных экзаменаў, калі б была магчымасць, можна было б залічваць усіх жадаючых, а адбор рабіць у працэсе вучобы. У замежных краінах, напрыклад, пры выпуску школьнік атрымлівае адпаведны рэйтынг. Гэта не нашы медалі, «вага» якіх, не сакрэт, вельмі розная. Неабходна, каб гэта быў сапраўдны рэспубліканскі рэйтынг, які б жорстка кантраляваўся. Над гэтым зараз працуюць спецыялісты, і, я думаю, што ў хуткім часе гэтая праблема будзе вырашана. Адпаведна знікнуць уступныя экзамены, і школа пратворыцца ў сапраўдную прыступку перад ВНУ.

— Якую частку сярод студэнтаў у вас займаюць «платнікі»?

— У нас на дзённай форме навучання такіх дзесьці 36 працэнтаў. Увогуле ж зараз змяняецца падыход да адукацыі: мы аказваем насельніцтву адукацыйныя паслугі, а дзяржава закрывае патрэбу ў спецыялістах шляхам пераводу на наш рахунак пэўнай колькасці бюджэтных сродкаў.

— Ці вялікая сёння колькасць жадаючых атрымаць вашы адукацыйныя паслугі?

— Раней быў перыяд, калі ўсе кінуліся гандляваць. Тады і ў нас студэнты «пабеглі» ў гэтую справу. Але ўсё хутка прайшло, і ўсе разумеюць, што перш за ўсё неабходна атрымаць добрую адукацыю — і будзеш мець выдатную перспектыву. Раней існаваў тэзіс: «адукацыю на ўсё жыццё», зараз — «адукацыю праз усё жыццё». І попыт сёння вялікі — у адной толькі нашай Вышэйшай школе кіравання і бізнесу зараз вучыцца 3,5 тысячы чалавек. Мы пры ўручэнні дыпломаў кажам сваім студэнтам: «Калі вы не будзеце вучыцца і далей, то абавязкова страціце кваліфікацыю». Інакш нельга, бо адукацыя фарміруе будучыню: чым вышэйшы ўзровень навучання, тым вышэйшы патэнцыял грамадства.

Гутарыў Мікалай ЛІТВІНАЎ.

КАМУ ВЫГАДНА ГАНДЛЯВАЦЬ ЛЕСАМ?

Праведзеная Камітэтам дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь праверка ажыццяўлення экспарту лесапрадукцыі паказала, што ў рэспубліцы з маўлівай згоды ці неўмяшання міністэрстваў і ведамстваў (у прыватнасці Мінлясгаса, канцэрна «Беллеспаперапрам», аблвыканкамаў і райвыканкамаў) ідзе, асабліва ў апошні год, інтэнсіўнае разбазарванне лясных рэсурсаў. Экспарт дзелавой драўніны ў аб'ёме каля 1 млн. куб. метраў увогуле афіцыйна не ўлічваецца і нікім не кантралюецца. А гэта шостая частка ўсёй дзелавой драўніны, якая нарыхтоўваецца ў рэспубліцы.

Толькі 50 працэнтаў рэалізацыі за мяжу лесаматэрыялаў прыпадае на асноўных экспарцёраў — Мінлясгас і канцэрн «Беллеспаперапрам». Другая палова іх прадаецца і перапрадаецца камерцыйнымі структурамі.

Усяго, паводле звестак Мінзнешэканомсувязяў, гэтым даходным бізнесам займаліся 933 структуры, непасрэдна не звязаныя з дзейнасцю лесапрамысловага комплексу рэспублікі. Іх павышаная цікавасць да беларускай драўніны тлумачыцца перш за ўсё тым, што, паводле даных Мінлясгаса, таксавы кошт асноўных парод драўніны (сосны, елкі) у рэспубліцы ў 15—20 разоў ніжэй, чым у Швецыі і Фінляндыі, і ў 4—6 разоў, чым у Расіі, а таксама параўнальна лёгкім доступам да яе.

Схема разбазарвання драўніны выглядае наступным чынам: камерцыйныя структуры на аўкцыёне купляюць драўніну на пні ці ў гатовым выглядзе ў прадпрыемстваў Мінлясгаса і канцэрна «Беллеспаперапрам», а далей, у абход Мінзнешэканомсувязяў і Мытнага камітэта, праз Расійскую Федэрацыю рэалізуюць яе ў краіны далёкага замежжа. На розніцы паміж унутранымі і мінімальнымі індыкатыўнымі цэнамі на лесапрадукцыю дзяржава губляе больш як 40 млн. долараў ЗША ў год.

Так, замежным прадпрыемствам «Белфарэст» (генеральны дырэктар Ю. І. Сячэйка) у 1997 годзе пастаўлена на экспарт 31,9 тыс. куб. метраў піловачніку (высокагатункавай дзелавой драўніны). Пры гэтым па шэрагу кантрактаў на яе пастаўку цэны былі ніжэйшыя за індыкатыўныя на 2,5—3 долары ЗША за 1 куб. метр драўніны. У 1998 годзе гэта прадпрыемства рэалізавала па цэнах, ніжэйшых за мінімальныя індыкатыўныя, расійскай фірме «Петратранслес» 1,0 тыс. куб. метраў піловачніку хвойных парод. У выніку сума сродкаў, недаатрыманых па гэтай прычыне, склала 818,7 млн. руб. Асноўнымі пастаўшчыкамі піловачніку для ЗП «Белфарэст», разам з камерцыйнымі структурамі, былі калгасы і дзяржгасы.

З-за недастатковага кантролю з боку Мінлясгаса, Віцебскага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання (ВЛГА), канцэрна «Беллеспаперапрам» за работай падведамных прадпрыемстваў урон дзяржаве ад рэалізацыі Расонскім лясгасам лесапрадукцыі па заніжаных цэнах камерцыйным структурам склаў 780,0 млн. руб.

Лясгас займаўся экспартам драўніны праз камерцыйныя структуры, нягледзячы на забарону на такое супрацоўніцтва з імі з боку вышэйстаячых арганізацый. Загадам міністра лясной гаспадаркі ад 10 красавіка 1998 года за дапушчаную безгаспадарчасць дырэктар Расонскага лясгаса Г. А. Турашаў вызвалены ад займаемай пасады.

Урон па ЗАТ «Мазырскі леспрамгас» ад такога экспарту лесапрадукцыі склаў каля 1,5 млрд. рублёў.

Калегія Камітэта дзяржкантролю рэкамендавала Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь распрацаваць і

МІНУЛАЯ СЛАВА БЕЛАРУСКІХ ІЛЬНАВОДАЎ ПАВІННА БЫЦЬ АДРОДЖАНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што адна з галоўных прычын заняпаду галіны зусім не ў недахваце фінансавых сродкаў, хоць і гэта мела месца, а перш за ўсё ва ўпушчэннях у рабоце Мінсельгасхарча, органаў улады на месцах, кіраўнікоў гаспадарак і прадпрыемстваў. Такі вывад не адмаўляў ніхто з тых, хто выйшаў на трыбуну нарады. Падкрэслівалася, што работа з ільном можа быць удзячным заняткам, за гэтай культурай — вялікая будучыня. І ў Беларусі яшчэ засталіся майстры высокіх ураджаяў. У прыватнасці, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Іван Шакола прывёў нямала прыкладаў паспяховай работы з ільном. Звыш 6 цэнтнераў валакна з гектара атрымалі 11 раёнаў. Яшчэ больш высокія вынікі маюць асобныя гаспадаркі. Так, калгас «1 Мая» Дзятлаўскага раёна на працягу многіх гадоў атрымлівае больш як 10 цэнтнераў ільноволакна з гектара. У 1997 годзе, калі ў многіх месцах ільнотрасту згнаілі на сцелішчах, калгас атрымаў 13,6 цэнтнера валакна з гектара, траста ішла нумарам звыш 1,4. Рэнтабельнасць ільнаводства ў гаспадарцы склала 50 працэнтаў. Больш падрабязна аб вопыце вырошчвання даўгунцу расказаў старшыня гэтага калгаса Васіль Сцяпура.

Упэўненасць у вялікіх перспектывах галіны выказалі ў сваіх выступленнях на нарадзе намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама, старшыня абласнога камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванню Уладзімір Адашкевіч, дырэктар НДІ аховы раслін Вілор Самерсаў, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі Докшыцкага райвыканкама Іосіф Палачанін і іншыя. У тым, што рэзервы галіны даволі вялікія, удзельнікі нарады пераканаліся на свае вочы, пабываўшы на Дубровенскім ільнозаводзе, дзе асвоена амаль безадходная тэхналогія перапрацоўкі трасты, і на 3-й фабрыцы Аршанскага льнокамбіната, дзе вырабляецца прадукцыя, прызначаная на экспарт. Яна адгружаецца ў краіны блізкага і далёкага замежжа, уключаючы ЗША.

Крызісная сітуацыя, паводле слоў прэзідэнта краіны, склалася не толькі з вытворчасцю, але і з перапрацоўкай ільну. Многія льнозаводы знаходзяцца ў гаротным стане, палова з іх мае абсталяванне, якое адпрацавала па 10—20 гадоў, што прыкладна ўдвая вышэй за норму.

Культурай сацыяльнай, культурай экспартнага значэння, культурай стратэгічнай назваў Аляксандр Лукашэнка лён і запатрабаваў ад урада і вядучых спецыялістаў галіны зрабіць яе эфектыўнай, рэнтабельнай, адрадзіўшы мінулую славу беларускіх ільнаводаў. Ён назваў канкрэтныя арыенціры: атрымаць у гэтым годзе 50 тысяч тон валакна, а ў 2000-м — выйсці на ўзровень 60 тысяч тон. Неабходна павысіць ураджайнасць ільноволакна не менш чым да 8 цэнтнераў з гектара, скараціць затраты на яго вытворчасць, забяспечыць высокую якасць і знізіць сабекошт. Для гэтага трэба шукаць прынцыпова новыя падыходы ў тэхналогіі вырошчвання і перапрацоўкі лёну, тэхнічна перааснашчаць галіну. Дарэчы, у Дуброўне льнаводы рэспублікі змаглі пазнаёміцца з выстаўкай тэхнікі, якая можа дапамагчы працаўнікам пазбегнуць ручной працы пры вырошчванні і перапрацоўцы прадукцыі. Выраб навінак пачаў бабруйскі завод «Аграмаш». Яго генеральны дырэктар Яўген Пахілка запэўніў у сваім выступленні, што прадпрыемства пойдзе насустрач усім жадаючым набыць такую тэхніку, знаходзячы кампрамісы ў аплаце паставак. Эфектыўнай мерай з'яўляецца таксама стварэнне спецыяльных уборачных атрадаў пры льнозаводах.

Уважліва выслухаў прэзідэнт рэспублікі думкі па пытаннях арганізацыйнага ўдасканалення галіны, яе фінансавай і матэрыяльнай стабілізацыі. Адны выказаліся за пераўтварэнне Аршанскага льнокамбіната ў холдынгавую кампанію, іншыя — за стварэнне рэспубліканскага аб'яднання «Лён» з гаспадарчаразліковымі суб'ектамі. Аляксандр Лукашэнка даручыў ураду ў двухмесячны тэрмін прыняць аптымальнае рашэнне. Магчыма, ільнаводства стане самастойнай галіной са сваім ведамствам. Што датычыць Аршанскага льнокамбіната, то прэзідэнт краіны падтрымаў яго генеральнага дырэктара Валерыя Шаткова, які прапанаваў захаваць на бліжэйшыя гады статус дзяржаўнага прадпрыемства, устрымаўшыся ад акцыяніравання, якое навязваецца «зверху», насуперак волі працоўнага калектыву.

Цяпер, калі рэспубліка стала на шлях устойлівага эканамічнага ўздыму, адзначыў Аляксандр Лукашэнка, упершыню прымаюцца такія значныя меры фінансавага ўмацавання ільнаводчай галіны. На стымуляванне вытворчасці лёну з бюджэту 1998 года выдзелена 280 мільярдаў рублёў. Ільнозаводам прадастаўлены крэдытныя банкаўскія рэсурсы для авансавання льнасеючых гаспадарак у разліку на палову кошту закупляемай сыравіны. У лютым гэтага года ўрад прыняў пастанову аб мерах па развіццю льнаводства ў рэспубліцы, у адпаведнасці з якой для камплектавання ўборачных атрадаў пры льнозаводах прадугледжваецца 40 мільярдаў рублёў беспрацэнтнай пазыкі, а таксама 35 мільярдаў для пагашэння банкаўскіх крэдытаў.

Кіраўнік дзяржавы таксама паведаміў, што льнаводы могуць разлічваць на добрую выручку. За тону валакна ўраджаю гэтага года будзе выплачвацца сума, эквівалентная 1100 доларам ЗША. На яго думку, трэба перагледзець практыку экспарту айчыннай ільнопрадукцыі, каб пазбегнуць сітуацыі 1997 года, калі амаль чвэрць агульнага аб'ёму вытворчасці валакна пайшла за мяжу праз пасрэднікаў.

Прагучала таксама думка аб аднаўленні ў больш дасканалым выглядзе прынцыпу матэрыяльнай і маральнай зацікаўленасці вытворцаў ільну. Ільняное поле - нядрэннае поле дзейнасці для маладзёжных арганізацый, БПСМ, БСМ, заўважыў прэзідэнт.

Удзельнікі нарады ў Оршы прыйшлі да высновы аб неабходнасці стварэння мэтавай дзяржаўнай праграмы па льнаводству. Яе аспекты будуць вызначаны ў падагульняючым дакументе нарады, які пасля дапрацоўкі з улікам выказаных заўваг і прапаноў стане здабыткам грамадскасці.

Вольга СІДАРОВІЧ, БЕЛТА.

Калгас «Рассвет» цвёрда стаў на шлях папраўкі

Учора Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з кіраўніцтвам і працаўнікамі калгаса «Рассвет» імя К.П. Арлоўскага Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці. На ёй аб выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы, зробленых на сустрэчы з «рассветаўцамі» 14 лістапада мінулага года, рабілі справаздачу старшыня Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванню аблвыканкама Уладзімір Адашкевіч і старшыня калгаса Валерый Іваноў.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, якую ён выказаў на пачатку сустрэчы, веснавыя пасяўныя работы ў «Рассвеце» праведзены на ўзроўні лепшых сельскіх гаспадарак у рэспубліцы, што сведчыць не толькі аб высокай кваліфікацыі і здольнасцях кіраўніцтва і спецыялістаў калгаса, а і пра тое, што людзі паверылі: яны могуць і павінны жыць нармальна.

Уладзімір Адашкевіч у сваім выступленні расказаў пра тое, што было зроблена ў «Рассвеце» за апошнія месяцы. Як вядома, летась 20 снежня на агульным сходзе працаўнікоў закрытае акцыянернае таварыства было пераўтворана ў калектыўную гаспадарку «Рассвет», якой было вернута імя Кірылы Арлоўскага. На сходзе быў таксама абраны старшыня калгаса Валерый Іваноў. Уладзімір Адашкевіч падкрэсліў, што пры прынятні рашэнняў былі захаваны ўсе існуючыя прававыя нормы. Пасля гэтага ў гаспадарцы адбыліся некаторыя кадравыя перастаноўкі (у асноўным, сярод матэрыяльна адказных асоб і бухгалтарска-эканамічных службаў), праведзена інвентарызацыя, уведзена новая сістэма аплаты, згодна з якой заробак кожнага калгасніка залежыць перш за ўсё ад эфектыўнасці працы. Амаль тры месяцы спецыялісты скурпулёзна разбіраліся з паямі былых акцыянераў, вялі разлік у адпаведнасці з рэальнымі грашовымі ўкладамі, якія ў свой час зрабілі людзі. Поўнасцю рэалізаваць прынцып сацыяльнай справядлівасці дапаможа абмеркаванне зробленых разлікаў у працоўным калектыве «Рассвета», у ходзе якога зараз прымаюцца заўвагі працаўнікоў і выпрацоўваюцца памылкі.

Спецыялістамі аблсельгасхарчу і Міністэрства сельскай гаспадаркі распрацаваны асноўныя накірункі развіцця калгаса «Рассвет», выкананне якіх на працягу двух гадоў дазволіць гаспадарцы выйсці на паказчыкі 1990 года. Вынікі работы «рассветаўцаў» на чале з новым кіраўніком за чатыры месяцы гэтага года сведчаць, што калгас сапраўды стаў на шлях папраўкі: вытворчасць мяса павялічылася на 80 працэнтаў, малака — на 30 працэнтаў, плюс 307 кілаграмаў надою на кожную карову, сёлета у «Рассвеце» плануюць атрымаць ураджай збожжавых 45—50 цэнтнераў з гектара: з дапамогай абласнога бюджэту былі набыты якаснае насенне, мінеральныя ўгнаенні, неабходныя сродкі аховы раслін. Якасць работ, якія праводзяцца на палях «Рассвета», дазволяць, лічаць спецыялісты калгаса, у бліжэйшым будучым вярнуць зямлі страчаную за апошнія гады ўрадлівасць. Хутка ў гаспадарцы запрацуюць усе, без выключэння, перапрацоўчыя прадпрыемствы і падсобныя прамысловыя промыслы.

Такія паказчыкі, па меркаванню кіраўніка аблсельгасхарчу Уладзіміра Адашкевіча, сведчаць пра тое, што ў выбары старшыні «Рассвета» і стратэгіі развіцця гаспадаркі памылкі не было, але, на яго думку, для таго, каб на працягу двух гадоў дасягнуць паказчыкаў 1990 года, калгасу патрэбна дапамога дзяржавы на зваротнай аснове. Дапамогі перш за ўсё патрабуе жывёлагадоўчая галіна калгаса. На рэканструкцыю ферм часоў Арлоўскага, дзе адсутнічае элементарная механізацыя працы, выдаткавана з абласнога бюджэту 3 мільярды рублёў, але гэтага недастаткова, каб набыць для малочнатаварных фермаў сучаснае галандскае абсталяванне. Старшыня «Рассвета» Валерый Іваноў падлічыў, што на гэтыя мэты патрэбна 38 мільярдаў рублёў з наступнай канвертацыяй. Ён лічыць, што крэдыт, які будзе ўкладзены ў аднаўленне асноўных фондаў, не толькі будзе вернуты ў тэрмін, але ў будучым прынясе дзяржаве значныя прыбыткі ў выглядзе падаткаў.

Іншыя просьбы кіраўніка «Рассвета» датычыліся адсоўвання тэрміну ўплаты штрафных санкцый, налічаных кантрольнымі органамі па выніках праверкі фінансава-гаспадарчай дзейнасці акцыянернага таварыства «Рассвет», зняцця мытных пошлін на ўвоз абсталявання для цяплічнай гаспадаркі, выдзялення фінансавых сродкаў для дабудовы ў калгасе дома для састарэлых людзей.

З усімі гэтымі просьбамі Аляксандр Лукашэнка даручыў разабрацца ў ніводным рамонце. Трэба абнавіць амаль 20 кіламетраў такіх магістраляў, каб яны бесперабойна працавалі зімой.

Кіраўнікам адміністрацый раёнаў сталіцы даручана ўзяць пад строгі кантроль даўжнікоў па кватэрнай плаце. Дарэчы, аналіз паказвае, што 40 працэнтаў злосных неплацельшчыкаў за кватэру — гэта сем'і з сярэднім дастаткам, якія могуць і павінны плаціць за сваё жыллё.

Выступаючы на пасяджэнні, прэм'ер-міністр Сяргей Лінг падкрэсліў, што ў мінулым годзе і ў I квартале гэтага года ўдалося дабіцца прыросту валавога ўнутранага прадукту без павелічэння спажывання энерганосьбітаў. А гэта ўжо вялікі крок наперад. Прычым вялікіх затрат для гэтага не запатрабавалася — проста на прадпрыемствах быў наведзены элементарны парадак.

Прэм'ер-міністр адзначыў, што для прадпрыемстваў важна зменшыць энергаёмістасць выпускаемай прадукцыі і, зразумела, знізіць яе сабекошт, інакш будуць страчаны традыцыйныя рынкі збыту.

Што ж датычыць забеспячэння энерганосьбітамі, то, паводле слоў Сяргея Лінга, урад сваю задачу выканаў. З газам і нафтай у нашай рэспубліцы праблем не будзе, падкрэсліў ён. Прэм'ер-міністр папярэдзіў кіраўнікоў прадпрыемстваў аб самай строгай адказнасці за аплату бягучых плацяжоў. Прадпрыемствы-даўжнікі проста не атрымаюць электраэнергіі і будуць вымушаны спыніць вытворчасць.

Аднак завяршылася пасяджэнне не на афіцыйнай ноце. Мэр Мінска Уладзімір Ярмошын ад імя ўсіх прысутных павіншаваў Сяргея Лінга з днём нараджэння і ўручыў яму вялікі букет пунсовых руж.

Аксана АСПІШЧАВА, БЕЛТА.

З ГАЗАМ І НАФТАЙ У БЕЛАРУСІ ПРАБЛЕМ НЕ БУДЗЕ

Два тыдні таму ў сталіцы закончыўся ацяпляльны сезон, які працягваўся крыху больш чым паўгода і прайшоў без сур'ёзных зрываў у энергазабеспячэнні. Але аб тым, ці будзе мінчанам цёпла і камфортна ў сваіх дамах бліжэйшай восенню і зімой, размова ішла ўжо 7 мая на пашыраным пасяджэнні Мінскага гарвыканкама. У яго рабоце прынялі ўдзел прэм'ер-міністр Сяргей Лінг, намеснік прэм'ер-міністра Генадзь Навіцкі, кіраўнікі шэрагу міністэрстваў і канцэрнаў.

Адкрываючы пасяджэнне, старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Ярмошын адзначыў, што падрыхтоўка да зімы запатрабуе велізарнага напружання сіл ад усіх камунальных службаў і гарадскіх ведамстваў. У абавязковым парадку спецыялісты «Мінскэнерга» павінны ў перыяд летніх выпрабаванняў выявіць тыя ўчасткі магістраляў цеплясетак, якія маюць патрэбу ў неадкладным рамонце. Трэба абнавіць амаль 20 кіламетраў такіх магістраляў, каб яны бесперабойна працавалі зімой.

Кіраўнікам адміністрацый раёнаў сталіцы даручана ўзяць пад строгі кантроль даўжнікоў па кватэрнай плаце. Дарэчы, аналіз паказвае, што 40 працэнтаў злосных неплацельшчыкаў за кватэру — гэта сем'і з сярэднім дастаткам, якія могуць і павінны плаціць за сваё жыллё.

Выступаючы на пасяджэнні, прэм'ер-міністр Сяргей Лінг падкрэсліў, што ў мінулым годзе і ў I квартале гэтага года ўдалося дабіцца прыросту валавога ўнутранага прадукту без павелічэння спажывання энерганосьбітаў. А гэта ўжо вялікі крок наперад. Прычым вялікіх затрат для гэтага не запатрабавалася — проста на прадпрыемствах быў наведзены элементарны парадак.

Прэм'ер-міністр адзначыў, што для прадпрыемстваў важна зменшыць энергаёмістасць выпускаемай прадукцыі і, зразумела, знізіць яе сабекошт, інакш будуць страчаны традыцыйныя рынкі збыту.

Што ж датычыць забеспячэння энерганосьбітамі, то, паводле слоў Сяргея Лінга, урад сваю задачу выканаў. З газам і нафтай у нашай рэспубліцы праблем не будзе, падкрэсліў ён. Прэм'ер-міністр папярэдзіў кіраўнікоў прадпрыемстваў аб самай строгай адказнасці за аплату бягучых плацяжоў. Прадпрыемствы-даўжнікі проста не атрымаюць электраэнергіі і будуць вымушаны спыніць вытворчасць.

Аднак завяршылася пасяджэнне не на афіцыйнай ноце. Мэр Мінска Уладзімір Ярмошын ад імя ўсіх прысутных павіншаваў Сяргея Лінга з днём нараджэння і ўручыў яму вялікі букет пунсовых руж.

Аксана АСПІШЧАВА, БЕЛТА.

«Звяздоўскі» прыз трапіў да ўладальніка-ветэрана напярэдадні свята Перамогі

Сімвалічным можна лічыць тое, што прыз «звяздоўскай» латарэі знайшоў свайго ўладальніка Васіля Барысенку, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, менавіта напярэдадні свята Перамогі.

Кавалер двух ордэнаў Айчыннай вайны, уладальнік многіх іншых узнагарод Васіль Мартынавіч зараз жыве ў горадзе Глыбокае, што ў Віцебскай вобласці. Ён ужо даўно выйшаў на пенсію (хутка споўніцца 82 гады). Адпрацаваў Васіль Барысенка больш за 50 гадоў.

Цікава было глядзець на фотаздымак маладога энергічнага выпускніка Тамбоўскага артылерыйскага збройнага вучылішча, даведацца, што паспеў ён папартызаніць у Беларусі, трапіць у канцлагер і закончыць вайну пад самым Берлінам.

«Звязду» сям'я Барысенкаў выпісвае ўжо больш за 15 гадоў. На пытанне, навошта не маладому чалавеку прыбор для завіўкі валасоў (менавіта такі выйгрыш дастаўся Васілю Мартынавічу), ён, усміхнуўшыся, адказаў: «Цырульню адкрыю». А калі сур'ёзна, то ў пераможцы 11 унукаў і 4 праўнукі! Знойдзецца куды прыз прыстроіць.

ГЛЯДЗІ І РАБІ ВЫСНОВЫ

Два аўтары — два погляды на з'яву, якая падзяліла XX стагоддзе на час да і пасля Чарнобыля. Фотавыстаўка твораў беларускага фотажурналіста Сяргея Брушко і яго калегі са Швейцарыі Хуга Йегі адкрылася ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь.

Хуга Йегі ўпершыню пабываў у Беларусі некалькі гадоў таму. Ад той паездкі засталася балючая памяць пра пакінутыя чарнобыльскія вёскі. З цягам часу ўпэўненасць у неабходнасці расказаць пра ўбачанае вылілася ў дакладна акрэсленую праграму: беларуска-швейцарскі праект «У пошуках Беларусі. 12 гадоў пасля Чарнобыля». У гэтым праекце шэраг выставак у розных гарадах Швейцарыі і ў Мінску, выданне альбома-каталога з рэпрадукцыямі фотаработ і артыкуламі, дзіцячыя сачыненні пра Чарнобыль.



Сумесная творчая праца беларускага і замежнага майстроў — нібыта погляд звонку і знутры на трагедыю, якую прынесла чалавецтву катастрофа на атамнай электрастанцыі. Абодва аўтары — удумлівыя аналітыкі, якія тонка адчуваюць настрой сваіх герояў.

Дарэчы, паглядзіце на два фотаздымкі з гэтай выстаўкі. На адным — людзі бадзёрыя і моцныя, на другім — у чаканні дапамогі ля аптэчных паліц з лекамі. Што ў гэтым фотапараўнанні — балючая хвароба, якая забірае з жыцця ўсё новыя і новыя ахвяры? А калі фотаздымкі памяняць месцамі — выздараўленне, аднаўленне пасля бяды? Прыходзьце на выстаўку, глядзіце, разважайце і рабіце высновы самі.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

«ТЫ ЧАСТА МНЕ СНІШСЯ, АПОШНІ ЗАЛП!..»

Напярэдадні Свята Перамогі ў рэдакцыю заўсёды прыходзяць ветэраны-«звяздоўцы». Мы, сённяшнія супрацоўнікі, шчыра віншуем іх, дорым кветкі, гаворым прыгожыя пранікнёныя словы... Яны ўсміхаюцца, цешачыся з новага пакалення, гавораць цёплыя словы ў адказ. У гэты дзень мы зноў — разам, зноў — адна каманда, адна рэдакцыя. У нас адно агульнае свята. Толькі ў нас, маладзейшых, яно проста — чырвоная дата ў календары, выхадны дзень, чаромха на вуліцах і ззянне медалёў і ордэнаў на грудзях у сівых людзей. А ў кожнага з іх, старэйшых, — свая вайна, свой Дзень Перамогі. Мо таму іх вочы ў гэты дзень блішчаць так, як ні ў кога з нас, якія чыталі пра вайну ў кніжках. Бо яны там, у далёкіх саракавых, яны ўспамінаюць, яны перажываюць усё кожны год зноў і зноў...

Іван Кандратавіч Казлоў зноў вяртаецца пад Маладзечна, куды ён, былы партызанскі радыст, маладзенькі супрацоўнік «Звязды», паехаў у пачатку мая 1945-га ў камандзіроўку. Памяць складае нібы адрывістую мазаіку: мулкі наган пад падушкай (без зброі ў 45-м было небяспечна), і раптоўная хаатычная страляніна пад вокнамі, і палохаючая здагадка (напалі бандыты!), і нараканне на лёс (загінуць напрыканцы вайны, прайшоўшы ўсе яе нягоды), і доўгачаканае, радаснае адкрыццё: гэта ж не бандыты, а святочны стыхійны салют. Таму што — Перамога!

Вайна для Ядвігі Францаўны Жызнеўскай — гэта родны Віцебск, захутаны ў цемру, шалёны бег па мосце, які ўжо бамбяць немцы, у рэдакцыю «Віцебскага рабочага», доўгая цяжкая дарога з Любаншчыны да Беластока, куды накіравалі па заданню Масквы для падпольнай работы. А Перамога — салют у Мінску, зноў шалёны, але ўжо ўтрапёна-радасны бег у рэдакцыю «Звязды», пачуццё гордасці, калі везла ў рэдакцыю шрыфт для экстраннага загалоўка нумара — «Перамога».

Для Аркадзя Апанасавіча Тоўсціка 9 мая 45-га — звычайны дзень армейскай службы. Вайна для яго скончылася толькі праз пяць гадоў, калі лясы Заходняй Беларусі былі ачышчаны ад былых паліцаяў і бандытаў. А ў той дзень... «Радасць, канешне, была вялізная, але расслабляцца нельга было: вораг быў яшчэ недабіты і вельмі небяспечны...»

Раіса Фёдараўна Самусенкава была ў вайну падлеткам. Але і сёння сніцца, не дае спакою той кашмар. Сняцца босыя ногі сялян, якія абступілі яе, параненую. А на вуснах часам з'яўляецца саланаваты смак крыві, якая капае з людзей, што ляжаць на ёй. І тады становіцца жудасна, і хочацца, як у тую страшную ноч Ушацкага прарыву, крычаць ва ўвесь голас, клікаць бацьку, рукамі і нагамі адчайна выкарабкавацца са страшнай ямы, напоўненай нерухомымі целамі... І штогод у пачатку мая зноў і зноў, як жывыя, праходзяць перад ёй маладыя хлопцы, дзяўчаты, якія з той блакады не выйшлі, якім і сёння па шаснаццаць-семнаццаць. І пах парахавога дыму, які невядома адкуль раптам бярэцца, не дае дыхаць, выядае вочы, як тады, больш за паўвека таму назад...

У іх вачах зноў ажываюць сполахі вайны. У іх вачах зноў загараецца шалёная, усепаглынальная радасць Перамогі...

У іх вачах часам з'яўляецца трывога: ці разумеем, ці задумваемся над іхняй вайной мы, тыя, што чыталі пра яе толькі ў кніжках...

Мы разумеем. Мы памятаем. Ваша вайна — наша вайна. Нам яна таксама сніцца. І таму нашу з вамі Перамогу мы не аддадзім нікому.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ВІНШАВАННІ

Уладзімір Іванавіч ШАПУЦЬКА!

Жонка, дзеці і ўнукі віншуюць Вас з 65-годдзем. Жадаюць моцнага здароўя, шчасця, доўгіх гадоў жыцця і ўсяго самага найлепшага.

г. Мінск.

*Віншуем з 90-годдзем **Міхаіла Іванавіча ЖДАНОВІЧА** з в. Рэчкі Чэрвеньскага раёна. Жадаем здароўя, шчасця, смеху і доўгага веку.*

Дзеці, унукі, г. Мінск.

*Сардэчна віншуем з 70-годдзем дарагую **Яніну Ніканораўну ЖУРАВЕЛЬ**. Жадаем моцнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця, дабрабыту і шчасця ў сям'і.*

Сястра Кацярына, брат Васіль, г. Мінск.

